Ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі пачаўся прыём дакументаў

# Для абітурыентаў - гарачая пара

**Сёлета ўступная кампанія мае шэраг істотных асаблівасцяў. Цэнтралізаваны экзамен і цэнтралізаванае тэсціраванне выпускнікі ўжо здалі па новых правілах - у адзіныя тэрміны. Цяпер жа абітурыенты павінны прадставіць пералік дакументаў і сертыфікаты экзаменаў у прыёмныя камісіі. Актуальныя правілы і навабвядзенні - у нашым матэрыяле.**



## Асаблівыя ўмовы прыёмнай кампаніі

Першая хваля прыёму дакументаў - для навучання на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі - пачалася 27 чэрвеня і працягнецца да 2 ліпеня. А з 4 па 10 - абітурыенты здадуць унутраныя ўступныя экзамены.

Сярод асаблівасцяў паступлення для абітурыентаў-мэтавікоў - парогавы сярэдні бал дакумента аб адукацыі. Цяпер, каб атрымаць мэтавае накіраванне, выпускнік павінен мець не ніжэй за 7 балаў у сярэднім па атэстаце. Таксама з гэтага года ёсць магчымасць паступіць па конкурсе сярод асобных арганізацый-заказчыкаў кадраў, калі конкурс па спецыяльнасці ў цэлым не склаўся.

Выпускнікі-медалісты, а таксама тыя, хто пасля заканчэння каледжа атрымаў дыплом з адзнакай, цяпер маюць яшчэ больш спецыяльных магчымасцей для паступлення. Так, рэгіянальныя вузы гатовы прыняць такіх абітурыентаў без экзаменаў амаль на ўсе спецыяльнасці. Выключэнне складаюць толькі медыцынскія кірункі, а таксама «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Праваназнаўства», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Усходазнаўства», а таксама спецыяльнасці, якія патрабуюць профільных іспытаў - «Творчасць», «Фізічная культура і спорт». У сталічныя ВНУ такая катэгорыя абітурыентаў зможа паступіць без экзаменаў на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці.

Пералік апошніх сёлета абнавілі - спіс папоўнілі 16 кірункаў. Дадатковыя пазіцыі - спецыяльнасці, запатрабаваныя арганізацыямі эканомікі і сацыяльнай сферы, - уключылі, каб найбольш матываваныя абітурыенты сталі студэнтамі абраных ВНУ, а арганізацыі атрымалі патрэбныя высокакваліфікаваныя кадры.

Агульны дзень пачатку прыёму дакументаў - 12 ліпеня. У залежнасці ад спецыяльнасці і ўмоў паступлення прыём працягнецца да 14, 17 ці 19 ліпеня.

Таксама пазбаўляюцца неабходнасці здаваць уступныя экзамены выпускнікі ліцэяў пры ўстановах вышэйшай адукацыі. Пры ўмове, што балы па ўсіх прадметах у іх атэстаце - не ніжэйшыя за 8, а па профільных прадметах - 9 і вышэй. Такой магчымасцю, у тым ліку, могуць скарыстацца выпускнікі ліцэя Беларуска-Расійскага ўніверсітэта.

Для выпускнікоў профільных класаў прафесійнай скіраванасці ўмовы застаюцца тымі ж - для паступлення ў ВНУ па спецыяльнасці ім трэба прайсці вусны этап.

Пераможцы ўніверсітэцкіх алімпіяд, колькасць якіх штогод павялічваецца, маюць магчымасць зарэгістравацца ў якасці абітурыентаў з 27 чэрвеня па 1 ліпеня.

## Магілёўскія ВНУ чакаюць студэнтаў

**Беларуска-Расійскі ўніверсітэт** прапануе будучым студэнтам навучанне па беларускіх і расійскіх адукацыйных праграмах. Як расказаў сакратар прыёмнай камісіі **Аляксандр Кашпар**, сур'ёзных змен у прыёмнай кампаніі не прадбачыцца.

- Летась наш універсітэт адкрыў навучанне па трох новых спецыяльнасцях, сёлета працягнем набіраць студэнтаў для навучання па існуючых напрамках. Усяго плануем прыняць 400 студэнтаў для навучання па беларускай адукацыйнай праграме за кошт бюджэтных сродкаў і 195 - па расійскай, 40 месцаў адводзіцца для платнага навучання. Прапануем таксама праграмы для завочнага поўнага і скарочанага навучання, - расказаў сакратар прыёмнай камісіі Аляксандр Кашпар.

Нагадаем: з гэтага года паступіць на завочнае аддзяленне любога ВНУ краіны не атрымаецца без наяўнасці хаця б 10 месяцаў стажу работы.

**Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А.А. Куляшова** імкнецца адпавядаць запытам часу, таму разам з класікай прапануе абітурыентам новыя актуальныя і запатрабаваныя навучальныя праграмы.

На факультэце замежных моў з гэтага года пачнуць навучаць студэнтаў па спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы: англійская і кітайская».

Выкладчыкаў прадмета «Ваенна-патрыятычнае выхаванне» пачынаюць рыхтаваць на факультэце фізічнага выхавання МДУ. І гэта ўнікальны для нашай краіны вопыт.

Яшчэ адна навінка гэтага году на факультэце - спецыяльнасць «Трэнерская справа: лёгкая атлетыка».

Як адзначыў начальнік аддзела рэалізацыі праграм даўніверсітэцкай адукацыі і прафарыентацыі ІПКіП **Аляксей Бірукоў**, сёлета МДУ ім. А.А. Куляшова чакае 847 першакурснікаў, з іх 555 прапаноўваецца навучанне на бюджэце.

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій** адкрывае новыя спецыяльнасці ў галіне нутрыцыялогіі і біятэхналогій. Профільныя спецыялісты запатрабаваныя сёння не толькі ў спорце і прамысловасці, але і ў штодзённым жыцці.

Дацэнт кафедры тэхналогіі хлебапрадуктаў **Вольга Цэдзік** адзначае:

- Сучасны спецыяліст у галіне харчовых тэхналогій павінен валодаць базавымі ведамі пра склад і ўласцівасці сыравіны і прадуктаў, харчовыя рэчывы і іх спажыванне, засваенне і вывядзенне. Усё гэта і многае іншае вывучае нутрыцыялогія.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце харчовых і хімічных тэхналогій па плане прыёму прадугледжана залічыць на першы курс для навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту 491 студэнта, з якіх 365 - на дзённую форму навучання.

*Алёна КУХАРАВА*

*Здымак носіць ілюстратыўны характар*